УДК 821.161.3-3.09

І. А. Міхновіч
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

ЖАНРЫ ЗАМОВЫ Ў ТВОРЧАСЦІ НІЛА ГІЛЕВІЧА

Уводзіны. Народная творчасць адна з жыватворных крыніц развіцця нацыянальнага прагрэсіўнага мастацтва і літаратуры. Аб вялікім значэнні фальклору ў развіцці літаратуры вельмі трапна пісаў А. М. Горкі: «Мільтан і Дантэ, Міцкевіч, Гётэ і Шылер уздымаліся вышэй за ўсё тады, калі іх акрыляла творчасць калектыву, калі яны чэрпалі натхненне з крыніцы народнай паэзіі, бязмерна глыбокай, незлічона разнастайнай, моцнай і мудрай». Значны ўклад як вучоны-тэарэтык унёс у беларускую фальклярыстыку Н. С. Гілевіч. Песенная творчасць беларускага народа разглядаецца ім у навукова-папулярным нарысе «Наша родная песня» (1968). З любасцю да вуснай паэзіі аўтар аналізуе творы ўсіх жанраў і відаў беларускай народнай лірыкі, выказвае слушныя думкі аб класіфікацыі песень, іх жанравых адзнаках і асаблівасцях паэтыкі. Гілевіч правільна ацэньвае вялікае значэнне песень як сродку патрыятычнага, сацыяльнага, этычнага і эстэтычнага выхавання моладзі. Ен разглядае таксама песні эпічнага і ліра-эпічнага складу. Сам пісьменнік сцвярджае «Кожны інтэлігент любой нацыі перш за ўсё і лепш за усё ведае культуру сваёй нацыі, і гэта натуральна» [1, с. 9].

Асноўная частка. Ніл Гілевіч выкарыстоўвае жанр замовы ў літаратурнай творчасці як форму, напоўненую сатырычным зместам.

Замова — гэта кароткі празаічны твор вуснай народнай паэзіі, своеасаблівая славесная формула, якая, паводле прымхлівых уяўленняў, мае магічную сілу — здольна ўздзейнічаць у пажаданым кірунку на знешні свет. У народзе замовы называюць яшчэ загаворамі, нагаворамі, шэптамі [2, с. 110].

Бытаванне замоў строга рэгламентавалася: іх можна было выконваць толькі ў пэўныя часы (на світанні або змярканні), у пэўным месцы (напрыклад, на скрыжаванні дарог), сам-насам або перад тым, каму яны адрасаваліся, і, нарэшце, толькі шэптам, прытым без перадыху. Такая знешняя атрыбутыка мела больш псіхалагічны характар і моцна ўражвала прысутных.

У колькасных адносінах публікацыі замоў у беларускім фальклоры ў параўнанні з іншымі фальклорнымі жанрамі займаюць апошняе месца. Тлумачыцца гэта тым, што іх запіс справа надзвычай складаная і цяжкая. Вядома, што носьбітамі замоў з'яўляліся прафесіяналы, так званыя знахары, шаптуны, чарадзеі, ведзьмакі, якія сакрэты свайго занятку трымалі ў глыбокай тайне, бо лічылі, што замовы пры перадачы іншым трацяць сваю сілу. Знахары перадавалі замовы ў выключных выпадках перад смерцю і толькі родным або вельмі блізкім. Да незнаёмых людзей, якія рантам праяўлялі цікавасць да замоў, знахары ставіліся ў вышэйшай ступені асцярожна і недаверліва, таму што пастаянна знаходзіліся ў атмасферы праследаванняў: са знахарамі вяло бязлітасную барацьбу праваслаўнае духавенства, называючы іх чарнакніжнікамі і язычнікамі; жорстка распраўляліся з імі афіцыйныя ўлады як з небяспечнымі для дзяржаўнай сістэмы элементамі; непрымірыма ставіліся да знахароў сельскія медыкі, лічачы іх (і не без падстаў) шарлатанамі і бачачы ў такіх лекарах сваіх канкурэнтаў. Знахароў прыцягвалі да «законнай адказнасці» за лячэнне без дыплома і без дазволу медыцынскіх устаноў.

Вялікую ролю у даследаванні замоў адыграў беларускі народны паэт і фальклярыст Ніл Гілевіч. Яго ўклад у фальклярыстыку ўключае збор і сістэматызацыю вуснай народнай творчасці, што стала адным з важных бакоў яго шматграннай літаратурнай дзейнасці. Шмат сіл ён аддаў збіранню вуснай народнай творчасці, не адзін раз выязджаў у фальклорныя экспедыцыі. Пад рэдакцыяй Ніла Гілевіча выйшлі некалькі тамоў беларускага фальклору ў сучасных запісах. Сярод іх «Песні сямі вёсак» (1973), «Песні народных свят і абрадаў» (1974), «Лірычныя песні» (1976), «Лірыка беларускага вяселля» (1979), «Народныя казкі, байкі, апавяданні і мудраслоўі» (1983) [3, с. 55].

Заключэнне. У сваіх замовах Ніл Гілевіч спрабуе паказаць беларускі народ як чысты, светлы і сумленны. Да яскравага прыклада можна аднесці замову «Ад раўнадушша і бюракратызму», дзе «*Малады маладзік, / Ты па небе хадзіў, / А не бачыў ні зорак, / Ні яснага сонца, / А не чуў ні стукату, / Ні грукату*» [4, с. 125]. Дадзеная цытата сведчыць аб тым, што чалавек, які знаходзіцца на высокай пасадзе, зусім не умее прыслухоўваца да народа, нават калі быць сумленным, то і ніколі не працаваў рукамі, толькі языком. «*...Завязала вочы слепата, / Залажыла вушы глухата, — / Не чую, не бачу / Ні скаргаў, ні плачу, / ні просьбаў, ні мольбаў*» [4, с. 125]. Цытата падкрэслівае абыякасць чалавека да народа, што ён не хоча і не будзе чуць ні скаргаў, ні плачу, ні просьбаў, ні мольбаў, тым самым паказваючы раўнадушша да ўласнага беларускага народа, які спадзяваецца на свайго абаронца, і з'яуляецца праменьчыкам надзеі для беларусаў. «*...А йдзі ж ты, слепата, / Ідзі, глухата, / На лясы дрымучыя, / На пяскі сыпучыя, / На балоты імшыстыя, / На берагі бераджыстыя, — / Там ваша племя і род, / А мяне выбіраў народ! / Цьфу! Цьфу*» [4, с. 125]. Мы бачым адносіны аўтара да такога кіраўніка, якія мы нікак не можам назваць станоўчымі. Пісьменнік мае на ўвазе, што такім людзям не месца на высокіх пасадах, ім патрэбны толькі грошы, а не людское шчасце, і іх месца на балотах і берагах, разам з дзікімі, племяннымі людзьмі, якія нічога не умеюць, але нават першабытная людзі працуюць больш за такіх кіраўнікоў. Кіраўніка выбіраў народ, і людскі абаронца не мае праў ставіцца да народа абыякава,

Репозиторий БарГУ

а пацвярджэннем з'яўляецца падвоенае слова «Цьфу!», якое менавіта і выкрывае адносіны Ніла Гілевіча да такіх бюракратычных людзей.

Заключэнне. Ніл Гілевіч выкарыстоўвае жанр замовы ў літаратурнай творчасці як форму, напоўненую сатырычным зместам, для выкрыцця раўнадушных і абыякавых да праблем народа бюракратаў. Хочацца таксама адзначыць, што дадзеная замова — не адзіная замова, дзе пісьменнік заклікае народ да годнага жыцця, таму што менавіта яно дано чалавеку адзін раз, і трэба пражыць яго сумленна.

Спіс цытуемых крыніц

1. *Нуждзіна, Т.* Ніл Гілевіч: маштабнасць таленту і веліч асобы / Т. Нуждзіна. — Мінск : Про Хрысто, 2015. — 178 с.
2. Беларуская вусна-паэтычная творчасць: падручнік для філалагічных спецыяльнасцей ВНУ / К. П. Кабашнікаў [і інш.]. — Мінск : Лексіс, 2000. — 512 с.
3. Беларуская вусна-паэтычная творчасць: падручнік для філалагічных спецыяльнасцей ВНУ / К. П. Кабашнікаў [і інш.]. — 2-е выд., перапрацаванае. — Мінск : Вышэйшая школа, 1988. — 414 с.
4. *Гілевіч, Н.* Кантора: сатыра і гумар / Н. Гілевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. — 165 с.

УДК 821.161.3

А. Ц. Наруць

Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАЯ ТЭМА Ў ПАЭМЕ «НАД НЁМАНАМ» С. ДЗЯРГАЯ

Уводзіны. У гісторыі беларускай літаратуры Заходняя Беларусь займае асаблівае месца. Раздзеленая паміж Польшчай і БССР пасля Рыжскага міру 1921 года, яна стала сімвалам нацыянальнай трагедыі і незгасальнай надзеі на ўз'яднанне. Лёс заходнебеларускіх земляў, жыццё і змаганне іх насельніцтва за захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці знайшлі сваё адлюстраванне ў творчасці шматлікіх беларускіх пісьменнікаў — М. Танка, П. Панчанкі, В. Таўлая, П. Пестрака. Сяргей Дзяргай у даваенны час быў рэпрэсіраваны, а ў гады Вялікай Айчыннай вайны цяжкая хвароба прыкавала яго да ложка, але ён тым не менш актыўна змагаўся супраць акупантаў разам з гомельскімі падпольшчыкамі [1, с. 35]. Паэт глыбока прачуў і адлюстраваў заходнебеларускую тэму ў паэме «Над Нёманам».

Асноўная частка. У першай палове XX стагоддзя Заходняя Беларусь стала арэнай складаных палітычных і сацыяльных працэсаў. Падзел Беларусі паміж Польшчай і БССР прывёў да драматычных наступстваў. Для беларускага насельніцтва гэта азначала нацыянальны прыгнёт, паланізацыю, эканамічную эксплуатацыю. Усе негатыўныя наступствы знайшлі адлюстраванне ў паэме «Над Нёманам».

Паэма распачынаецца апісаннем восеньскага пейзажу над ракой Нёман. Герой твора, знаходзячыся на беразе, паглыбляецца ў разважанні пра гісторыю і лёс роднай зямлі. Праз успаміны і роздумы паўстаюць вобразы мінулага, гераічныя і трагічныя падзеі беларускай гісторыі, а таксама жыццё простых людзей. Паэма прасякнута любоўю да роднай зямлі, болем за яе мінулае і трывогай за будучыню. Лірычны герой адчувае боль за свой народ, які знаходзіцца пад чужым панаваннем. Трагізм становішча беларускага селяніна, адарванага ад р зямлі перадаецца ў насупных радках: «*Наша доля!.. ворагу не зыч яе. / А чаму, унучак? Эх, зямліцы б нам. / У зямліцы — шчасце ўсё мужыцкае*» [2, с. 235].

Паэма стварае яркія вобразы заходнебеларускай вёскі. Аўтар звяртае ўвагу на цяжкую працу сялян, на іх нягоды і пакуты. Але разам з тым ён паказвае і духоўную сілу народа, яго імкненне да захавання роднай мовы і культуры. Гэтыя словы выказваюць пратэст супраць панавання польскіх паноў, супраць нацыянальнай няроўнасці: «*Не для вас адных слядочкі заліцава… / Не, панкі, далёка і да звера вам…*» [2, с. 237].

У паэме С. Дзяргай знаходзіць адлюстраванне гістарычнай рэальнасці Заходняй Беларусі таго часу. Паэт з болем падкрэслівае трагедыю раздзеленага народа. Вобраз дзяўчыны, якая плача «*жальбаю ад Нёмана да Прыпяці*» [2, с. 237], — метафара пакуты ўсёй Заходняй Беларусі, падзеленай межамі. Плач дзяўчыны як увасабленне смутку па ўсёй зямлі Заходняй Беларусі, адлюстроўвае боль расстання, сацыяльнай несправядлівасці і прыгнёту.

Урывак пачынаецца з моцнага вобраза глебы, хлеба, які вырашчаны працай сялян, але належыць панам і багатым: «*Глеба, глеба! — хлеб гатовы ў дзежачцы / Панская, скарбовая, кляшторная!... / А зямля ж аратаму належыць нестуе*» [2, с. 238]. Гэта яскрава падкрэслівае сацыяльную несправядлівасць, калі праца аратая не ацэньваецца, а плод яго намаганняў ідзе на карысць іншым. Народ жыве ў нястачы, і адзінае, што застаецца — пеставаць нянавісць да тых, хто жыве ў дастатку, а гэты ўсё выклікае горыч і адчуванне няпраўды: «*Так жыве народ, нянавісць пестуе!*» [2, с. 238].

Памяць пра мінулае, родныя мясціны і сем'і становіцца балючым кантрастам з сучаснай рэальнасцю. Вёска страціла свой першапачатковы выгляд, многія людзі памерлі ці пакінулі зямлю бацькоў. Зруйнаваныя надзеі на лепшае жыццё прыводзяць да трагедыі: «*Тут — хадзіў, старцоў, бывала, вадачы. / Назве... А ўсё перайначана! / Там — жылі-былі калісьці родачы, / Брат стрэмечны, ўся радзіна матчына...*» [2, с. 238].

Репозиторий БарГУ